ции, направленные преимущественно на определенный объект (человека или явление), – *ненависть*, *презрение*, *горе*, *осуждение*, на страницах издания практически не выражены. Вместе с тем в текстах английских и белорусских изданий обращает на себя внимание высокая образность языковой подачи материала, отрицательная и положительная знаковость эмотивной лексики с использованием атрибутивных лексем и словосочетаний.

Можно отметить, что в анализируемых текстах множество сходств и различий, обусловленных особенностями языковых систем, особенностями журналистской стратегии, а также особенностями редакционной политики. Несмотря на различия, эмотивная лексика, вербализующая негативные эмоции, в пространстве публицистических текстов во многом определяет значимость журналиста и издания, популярность публикаций, делая текст газетной публикации ярким, насыщенным, адресным, близким к читателю.

Литература

1. Барбашова, В. П. Лингвометодические аспекты профессионально ориентированного обучения иностранным языкам: традиции и инновации : коллективная монография / под ред. В. П. Барбашова, И. И. Климовой, М. В. Мельничук, Л. С. Чикилева. – М. : Финансовый университет, 2014. – 240 с.
2. Шаховский, В. И. Лингвистическая теория эмоций : монография / В. И. Шаховский. – М. : Гнозис, 2008. – 416 с.
3. Roget's Thesaurus of English Words and Phrases. N. Y. : Thomas Y. Crowell, 2016. – 652 p.

## ВЫКЛІЧНІКАВЫЯ ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ ЯК СРОДКІ ВЫРАЖЭННЯ ЭМОЦЫЙ ЧАЛАВЕКА (НА МАТЭРЫЯЛЕ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ ЯНКІ КУПАЛЫ)

**Д. А. Скоблік**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік д-р філал. навук, праф. В. А. Ляшчынская

Эмоцыі і пачуцці абазначаюцца рознымі моўнымі сродкамі: словамі (*абурэнне*, *агіда*, *боязь*, *гнеў* і іншыя), парэміямі (*баязліваму і корч мядзведзь*; *баязліўцу і заяц – воўк* і іншыя), фразеалагізмамі (*душа ў пятках*; *кроў ледзянее*; *на сёмым небе*; *рваць сабе душу*; *скрыгатаць зубамі* і іншыя), апошнія з якіх шырока прадстаўлены ў мове Янкі Купалы рознымі адзінкамі паводле паходжання, семантыкі, структуры, суаднесенасці з часцінамі мовы. Значную частку сярод фразеалагічных запасаў пісьменніка складаюць выклічнікавыя фразеалагізмы (ВФ), пад якімі разумеюцца ўстойлівыя выразы, што суадносяцца з выклічнікамі, і якія выражаюць розныя эмоцыі або пабуджэнні да якіх-небудзь дзеянняў. Менавіта ВФ мовы твораў класіка беларускай літаратуры, якія складаюць адметнасць яго стылю, вызначаюць выключную ролю мастака, сталі аб'ектам нашага вывучэння. Крыніцай збору ВФ паслужыў «Слоўнік фразеалагізмаў мовы твораў Янкі Купалы» [1].

Вядома, што ВФ не абазначаюць і не называюць розныя пачуцці, але пры гэтым яны, як і словы-выклічнікі, «маюць усвядомлены калектывам сэнсавы змест» [2, с. 110]. Асабліва выразна эмацыянальную функцыю даводзяць ВФ-адзінкі, якія, як і ўвогуле выклічнікі, паводле выказвання В. У. Вінаградава, «асэнсаваны як калектыўныя знакі эмацыянальнага выражэння душэўнага стану [3, с. 585], а як зазначае І. Я. Лепешаў, «толькі і служаць для выражэння эмоцый, перажыванняў, настрою, адчуванняў» [4, с. 87].

Адну з колькасных груп у мове Я. Купалы складаюць ВФ для выражэння эмоцыі здзіўлення, аднак толькі адзінкавыя сапраўды выражаюць здзіўленне (*мядзведзь здох* – [Мікіта:] *Каго я бачу, меджду протчым! Якое неспадзяванае спатканне! Ці не **мядзведзь** здох? «Тутэйшыя»*; *вось яно што* – [Сын:] ***Вось яно што!*** *Праўда, мамка, Ўжо сабе ўтлумачыў: Беларус я!* «Сын і маці»; *падумаць толькі, на табе* – [Марыля:] *Гэта ж **толькі падумаць**, дзедка. Мала ўсялякага безгалоўя, а тут на табе, яшчэ гэта хвароба.* «Раскіданае гняздо»). Усе астатнія служаць для выражэння не толькі эмоцыі здзіўлення, але і іншых: *бач ты* <*яго* (*яе*)> – вокліч для выражэння здзіўлення, нязгоды, пярэчання; *ну* (*цю*) *іх да ста бесаў* – выказванне здзіўлення, абурэння; *святы бог з вамі* – выказванне як папярэджанне страху, вокліч здзіўлення; *божа дарагі* – вокліч для выражэння здзіўлення, гневу, абурэння, роспачы, пачуццяў страху, узрушэння і пад.; *не дай божа* – вокліч для выражэння здзіўлення, шкадавання; *што за ліха* – вокліч здзіўлення, незадавальнення, неразумення; *што за немач* – вокліч незадавальнення, здзіўлення, абурэння і падобнае; *трэба ж* – вокліч здзіўлення, абурэння; *вось табе і на* – вокліч здзіўлення, расчаравання і іншае. Гэта адзінкі, што падпадаюць пад адзнаку поліафектыўных: адзін і той жа фразеалагізм можа выражаць як эмоцыю здзіўлення, так і іншыя. Напрыклад, *не дай божа*, сапраўды, выражае эмоцыю здзіўлення і адначасова пачуццё страху, узрушэння, што і даводзіць кантэкст *Золь, слата, што **не дай Божа**!*

Колькасна прадстаўлены ў мове Купалы ВФ для выражэння эмоцыі злосці. Але і тут адзначаецца іх поліафектыўнасць, паколькі яны спалучаюць выражэнне не толькі злосці, але і іншых эмоцый, напрыклад, *пся крэв* (*крэў*) – выражэнне злосці, раздражнення; *каб ты бокам ездзіў* – вокліч абурэння, злосці, раздражнення; *каб яму моль пяты пабіла* – вокліч для выражэння злосці, абурэння кім-, чым-небудзь, праклён; *каб таму па локаць адсушыла рукі* – выказванне для выражэння негатыўных адносін, праклён; *каб ім ні дна ні пакрышкі* – выказванне незадавальнення чым-небудзь, злосці на што-небудзь; *ліханька ж бы на іх* – выказванне абурэння, злосці, раздражнення і падобнае; *каб ты лопнула была* – вокліч раздражнення, злосці на што-, каго-небудзь; праклён; *каб цябе мор* – вокліч незадавальнення, злосці; *а немач цябе ведае* – выражэнне абурэння, злосці на каго-небудзь; *каб пярун спаліў* – выражэнне абурэння, раздражнення, злосці на што-небудзь.

ВФ характарызуюцца нядобразычлівымі пажаданнямі, найбольш часта называючы ўсе негатыўныя з'явы, якіх баяўся чалавек у мінулым, перадаючы такім чынам наказ, правіла, што пажаданне гэтага ў стане раздражнення, злосці, абурэння нядобра. Сродкамі ВФ беларус выражае не толькі свой стан раздражнення, але і іншыя эмацыянальныя станы, пры гэтым як адмоўныя – *злосць*, *абурэнне*, так і станоўчыя – *здзіўленне* і *захапленне*. І ва ўсіх выпадках выклічнікавыя фразеалагічныя адзінкі – гэта прастамоўныя сродкі для выражэння чалавекам яго эмацыйнага стану ў пэўнай сітуацыі, што з'яўляецца паказчыкам негатыўнай канатацыі, гэта адно з найменняў хваробы тыпу ліхаманкі, халеры і падобнае. Выдзеленыя ВФ, што рэпрэзентуюць эмоцыю раздражнення, як і іншыя, выступаюць у форме самастойных выказванняў, напрыклад, ВФ *хай яно згарыць* – дадзены ўстаўны сказ са злучнікам *хай*, а ВФ *каб ты згінуў*, *каб ты лопнула была*, *каб цябе* (*іх*) *паляруш* – дадзеныя сказы са злучнікам *каб*.

Для выражэння дзвюх супрацьлеглых эмоцый задавальнення і незадавальнення ў мове Купалы выкарыстаны свае адзінкі, але найбольш для выражэння незадавальнення, напрыклад, *каб ім ні дна ні пакрышкі*; *хай* <*яна*> *загіне*; *каб ты згінуў*; *каб цябе ліхаманк*; *а бадай жа на іх немач* і іншыя. Але пры гэтым і тут эмоцыя незадавальнення ў спалучэнні з іншымі эмоцыямі: *што за ліха* – вокліч здзіўлення,

незадавальнення, неразумення; *каб цябе мор* – векліч незадавальнення, злосці; *што за немач* – векліч незадавальнення, здзіўлення, абурэння і іншыя.

І толькі ў адным выпадку зафіксаваны ВФ для выражэння задавальнення: што за дзіва, які выражае эмацыянальныя адносіны да чаго-небудзь (захаплення, задавальнення і падобнае), напрыклад, – *І глядзіце*, ***што за дзіва****! Наракаць не трэба*. «Зашумеў лес разгуканы».

Яшчэ адна эмоцыя, рэпрэзентаваная ў фразеалогіі, – гэта адчай як адмоўная астэнічная эмоцыя, эмацыйны стан, які з'яўляецца, як правіла, следствам перажывання крызісных з'яў і выяўляецца ў часовай прыгнечанасці, нежаданні што-небудзь рабіць. У «Слоўніку фразеалагізмаў мовы твораў Янкі Купалы» выдзелены такія адзінкі, дзе толькі акцэнтуецца ўвага на роспачы, адчаю (*божухна мой*; *хоць жывы лезь у дамоўку*; *хоць у процьму ты скоч*; *хоць рэжся*; *хоць налажы ты галавой*; *хоць свету не бач*), але многія ВФ выражаюць адчай, роспач у спалучэнні з іншымі эмоцыямі, многія з якіх ужо ўзгадваліся раней (*божа дарагі* – векліч для выражэння здзіўлення, гневу, абурэння, роспачы, пачуццяў страху, узрушэння і падобныя; *хай яно згарыць* – выказванне раздражнення, адчаю і іншыя).

У беларускай літаратурнай мове канцэптуалізацыя розных эмоцый адлюстроўвае калектыўнае ўяўленне беларусаў пра гэтыя эмоцыі, якое замацоўваецца дзякуючы адлюстраванню ў фразеалагізмах тыповых сітуацый, што выклікаюць іх, а яшчэ фіксацыі асацыяцый, якія засноўваюцца на якім-небудзь эмацыянальным вопыце. Яшчэ можна адзначыць, што канцэптуалізацыя эмоцый задавальнення–незадавальнення выступае ў двух супрацьлеглых вымярэннях і ацэнках, пры гэтым большасць фразеалагізмаў-намінантаў эмоцыі характарызуе і ацэньвае эмоцыю незадавальнення.

Усе выклічнікавыя фразеалагічныя адзінкі, што зафіксаваны ў «Слоўніку фразеалагізмаў мовы твораў Янкі Купалы», у пераважнай сваёй большасці характарызуюцца негатыўнай канатацыяй, нясуць дадатковыя звесткі пра мінулае жыццё чалавека. Пры гэтым адмоўная ацэнка датычыць тых фактаў, што прыносіць шкоду чалавеку ўвогуле. Тут пажаданні-праклёны звязаны з негатыўнымі дзеяннямі для чалавека, што даводзяць дзеяслоўныя кампаненты згарыць, згінуў, лопнула і іншыя. Важна тое, што зафіксаваныя фразеалагізмы ўзніклі і прадаўжаюць існаваць не дзеля фіксацыі, узнаўлення тых фактаў, што паслужылі вобразнай асновай іх, а з мэтай засвоіць, асэнсаваць своеасабліва сфармуляваныя правілы (хутчэй антыправілы), каб не паўтараць такое, каб спасцігнуць навуку продкаў, тым самым быць з'яднанымі з імі памяццю і шляхам засваення і перадачы наступным пакаленням быць аб'яднанымі ў народ з выпрацаванымі і характэрнымі для яго правіламі і нормамі жыцця.

Літаратура

1. Ляшчынская, В. А. Слоўнік фразеалагізмаў мовы твораў Янкі Купалы / В. А. Ляшчынская, З. У. Шведава ; М-ва адукац. Рэсп. Беларусь, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2007. – 312 с.
2. Лепешаў, І. Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы : вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Выш. шк., 1998. – 271 с.
3. Виноградов, В. В. Основные типы фразеологических единиц в русском языке / В. В. Виноградов // Русский язык (грамматическое учение о слове) / В. В. Виноградов. – М. : Высш. шк., 1972. – 613 с.
4. Лепешаў, І. Я. Праблемы фразеалагічнай стылістыкі і фразеалагічнай нормы / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 262.